*Литература*

1. Айрис, А., Бюген Ж. Управление медиа-компаниями: реализация творческого потенциала / Аннет Айрис, Жак Бюген / Пер. с англ. Ю.А. Константинова, Д.И. Эркенова. М.: Издательский дом «Университетская книга»»: АНО «ШКИМБ», 2010. – 560 с.
2. Гуревич, С.М. Газета: вчера, сегодня, завтра: учеб. пособие / С.М. Гуревич. – М.: Аспект Пресс, 2004. – 288 с.
3. Интернет-СМИ: теория и практика / под ред. М.М. Лукиной. – М.: Аспект Пресс, 2011. – 348 с.
4. Калмыков, А.А., Кохонова Л.А. Интернет-журналистика: учеб. пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности 021400 «Журналистика» / А.А. Калмыков, Л.А. Кохонова. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2005. – 383 с.



**Валянціна Зразікава**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*


# ЖАНРАВЫЯ РАЗНАВІДНАСЦІ ЗАМАЛЁЎКІ Ў БЕЛАРУСКІХ ІНТЭРНЭТ-СМІ

Няспыннае развіццё і ўкараненне новых інтэрнэт-тэхналогій у сучасную камунікацыйную прастору шмат у чым абумовілі перагляд традыцыйных падыходаў да журналісцкай творчасці. Змены закранулі і сістэму медыяжанраў, дзе назіраюцца тэндэнцыі дыфузіі (узаемапранікнення), трансфармацыі, крэалізацыі, з’яўлення новых формаў і спосабаў рэпрэзентацыі інфармацыі (вэб-рэпартаж, інтэрнэт-канферэнцыя, анлайн-трансляцыя, мультымедыйны лангрыд). Як слушна заўважае беларуская даследчыца Т.Д. Арлова, сёння жанравая асаблівасць журналісцкага твора – вызваленне ад жанравых рамак, цалкам вольнае чаргаванне дакументальнага, біяграфічнага, публіцыстычнага, мастацкага [5].

Артыкул прысвечаны аналізу жанравых разнавіднасцей замалёўкі – варыянтаў ці мадыфікацый жанру, якія найбольш часта сустракаюцца ў журналісцкай прыктыцы. Эмпірычнай базай даследавання сталі журналісцкія матэрыялы, апублікаваныя ў інтэрнэт-версіях друкаваных газет, на сайтах беларускіх інтэрнэт-выданняў і інфармацыйных парталаў.

Спачатку ўдакладнім, якое месца займае замалёўка ў жанравай сістэме масмедыя. Некаторыя расійскія вучоныя, у прыватнасці, Г.В. Лазуціна, М.М. Кім, разглядаюць замалёўку як малую форму нарыса ці жанравую мадэль нарысавых тэкстаў [3, 4]. Не вылучае

замалёўку ў асобны жанр і даследчык А.К. Бабкоў, які вызначае яе як прамежкавы жанр, дзе спалучаюцца і рэпартажныя прыёмы, і мастацка-публіцыстычныя: «Менавіта публіцыстычнасць, вобразнасць, багацце літаратурна-стылёвых прыёмаў збліжае замалёўку з нарысам і дазваляе гаварыць аб замалёўцы як малой форме нарыса» [1, с. 37]. У той жа час даследчык спасылаецца на работы У.П. Уладзімірцава, які адзначае, што замалёўка – гэта жанр двайного стандарту і двайного падпарадкавання. З аднаго боку, па прыкмеце фактаграфічнай дакументальнасці, адраснасці, відавочнай інфармацыйнай прычыне замалёўка адносіцца да інфармацыйнай журналістыкі. Але, з другога боку, па прыкмеце маўленчай і вобразнай экспрэсіі, паэтычнасці і лірызму замалёўка імкнецца да мастацкай літаратуры. Таму аб якасцях замалёўкі трэба меркаваць зыходзячы з яе прыроднай двуеднасці: наколькі твор адпавядае патрабаванням аператыўнай журналісцкай злабадзённасці і ў той жа час наколькі паэтычным і вобразным з’яўляецца маўленчае (вербальнае) увасабленне інфармацыйнага складніка [1, с. 39]. Магчыма, у такім разе мэтазгодна вылучаць замалёўкі інфармацыйныя і мастацкія (па аналогіі, напрыклад, з інтэрв’ю – інфармацыйнае, аналітычнае).

Мы падтрымліваем думку аднаго з заснавальнікаў беларускай школы журналістыкі, вядомага публіцыста Б.В. Стральцова, які адносіць замалёўку да групы інфармацыйных жанраў: «У пэўным сэнсе жанрам, блізкім рэпартажу, з’яўляецца замалёўка. У свой час яе нават разглядалі як унутрыжанравы від нарыса: пакуль не пераканаліся, што гэта, хоць у пэўным сэнсе блізкія, але розныя літаратурныя формы. Будаўнічы матэрыял у нарысе (падзеі, эпізоды з жыцця дзеючых асоб твора, канфліктныя сутыкненні, здарэнні) з’яўляецца фактычнай асновай для стварэння мастацка-публіцыстычных вобразаў, распрацоўкі канцэпцыі чалавека ці сітуацыйнай канцэпцыі розных сфер грамадскага жыцця. У замалёўцы ж факт, эпізод, падзея самі знаходзяцца ў цэнтры адлюстравання – аўтар стварае іх індывідуальны вобраз. Нарыс – жанр мастацка-публіцыстычны, аналітычны. Замалёўка ж – гэта вобразная інфармацыя. Што іх збліжае, дык гэта вобразнасць адлюстравання, адзіная палітра моўна-стылёвых сродкаў» [6, с. 16].

Адсутнасць у жаналогіі адзінага меркавання па гэтым пытанні сведчыць аб тым, што прырода замалёўкі больш складаная і дыялектычная, чым можа падацца на першы погляд. Нягледзячы на тое, што па сваёй форме яна ўяўляе «сціплы», кампактны і адносна малааб’ёмны спосаб аператыўна адгукнуцца на падзеі, з’явы грамадска-палітычнага

жыцця або распавесці аб людзях, іх характарах, захапленнях, на самай справе замалёвачныя мініяцюры маюць важнае значэнне ў іерархіі СМІ. Яны маркіруюць (пазначаюць) сувязь публіцыстычнага (інфармацыйнага) пачатку з вобразным (эстэтычным), апрацаваным па законах мастацкага тэксту. Таму ад журналіста праца над замалёўкай патрабуе не меншага творчага запалу і майстэрства, чым пры стварэнні матэрыялаў больш аб'ёмных фарматаў. Да таго ж сваёй мініяцюрнасцю замалёўка адпавядае сучаснай тэндэнцыі да інфармацыйнага лаканізму, найбольш уласцівай якраз анлайнаваму асяродку.

Адметныя рысы замалёўкі закладзены ў самой прыродзе яе намінацыі: журналіст, як мастак, малюе, жывапісуе, але не фарбамі, а словамі. Адсюль і канцэнтрацыя ўвагі аўтара не на мностве прадметаў і выяў (як, напрыклад, у рэпартажы), а на адзінкавым аб'екце (асобе, з'яве, падзеі), і памкненне «замаляваць» нейкі адзін штрых, які выклікаў бы адпаведныя эмоцыі. Прывязка да дакументальнай дакладнасці ўбачанага ў замалёўцы спалучаецца з вобразным пераасэнсаваннем фактаў, паэтызацыяй рэчаіснасці, аўтарскім прачытаннем жыццёвага матэрыялу сродкамі моўнай выразнасці. Пры ўдалым выбары слова нават з мінімальнага кантэксту паўстае вобраз, а замалёўка якраз і заснавана на вобразным адлюстраванні [6, с. 13]. Вобразнасць звычайна праяўляецца на ўзроўні ўжывання разнастайных тропаў.

Аснова замалёўкі – назіральнасць, уласнае ўражанне, уменне выбраць самае значнае і тыповае з гушчы характараў, падзей, сітуацый. Замалёвачныя публікацыі часта звяртаюцца да свету чалавека, прыроды, таму адрозніваюцца эмацыянальнай інтанацыяй аповеду. Журналіст імкнецца выклікаць у чытача тыя ж эфекты ўспрымання, што адчуў сам пры сутыкненні з рэчаіснасцю. У полі зроку журналіста знаходзіцца шматвобразны свет ва ўсіх яго праявах. Перапрацоўваючы мноства фактаў рэчаіснасці, ён адбірае толькі тыя з іх, што найбольш яскрава адлюструюць аўтарскую задуму. Таму ўнутрыжанравае разгалінаванне замалёўкі абумоўлена розным прадметам адлюстравання рэчаіснасці, у залежнасці ад чаго вылучаюць наступныя яе мадыфікацыі: *партрэтная* (чалавек ці група людзей), *пейзажная/натурная* (прырода, навакольнае асяроддзе), *падзейная* (падзея, сацыяльная з'ява).

Кожны з узгаданых тыпаў мае розную ступень запатрабаванасці і эфектыўнасці выкарыстання ў беларускіх інтэрнэт-СМІ. Пры гэтым назіраецца такая заканамернасць: найбольш поўна і шырокафарматна жанравыя разнавіднасці замалёўкі адлюстраваны ў электронных версіях

друкаваных газет, найменш – на сайтах інтэрнэт-выданняў і вельмі рэдка – у межах інтэрнэт-парталаў. Гэта тлумачыцца тым, што жанравыя формы замалёўкі ў электронных версіях прынцыпова не адрозніваюцца ад тых, што былі ў СМІ да з’яўлення інтэрнэту. Нягледзячы на тое, што беларускія анлайнавыя версіі пастутова выпрацоўваюць і ўдасканальваюць спецыфічныя прыёмы і спосабы работы з інфармацыяй у інтэрнэце (інтэрактыўнасць, мультымедыйнасць, мабільнасць, гіпертэкставасць), у большасці выпадкаў яны пераносяць, імпартуюць у глабальную сетку традыцыйны вопыт.

У адрозненне ад іх выданні, якія не маюць афлайнавых адпаведнікаў, выкарыстоўваюць не толькі класічныя мадэлі, але і шукаюць свае, узбагачаюцца новымі, раней не вядомымі, арыентуючыся на візуальны характар успрымання інфармацыі. Таму новыя магчымасці замалёўкі імі да канца яшчы не раскрытыя і не спасцігнутыя, хаця творчы патэнцыял жанру навідавоку. Прычына рэзервнага стану замалёўкі абумоўлена і тым, што падобныя выданні імкнуцца да максімальнай інфармацыйнай рэнтабельнасці, сфакусаванасці, рацыянальнасці, што не зусім адпавядае мастацка-вобразнаму зместу замалёўкі, якая сёння – адхіленне ад галоўнага інфармацыйнага курсу, другасная, незапатрабаваная інфармацыя. Узгадваюцца словы Б.В. Стральцова, якія не страцілі сваёй актуальнасці і зараз: «….Трэба развіваць тэндэнцыю эстэтызацыі газетных тэкстаў, аддаючы перавагу фіксацыі фактаў у выразнай, вобразнай форме, і эмацыянальна-вобразнаму маналогу пры распрацоўцы тэмы. Вялікую ролю ў публіцыстычным формаўтварэнні, эстэтызацыі журналісцкай творчасці адыгрывае валоданне прыёмамі вобразнай інфармацыі. Замалёвачныя кампаненты надаюць новае гучанне старым жанравым формам, актывізуюць чытацкае ўспрыманне» [6, с. 21].

Паводле нашых назіранняў, адной з самых папулярных разнавіднасцей інтэрнэт-замалёўкі выступае *партрэтная*. Яна прысутнічае ў большасці анлайн-версій беларускіх газет, асабліва рэгіянальных: «Одна песня на двоих», «Формула счастья» («7 дней», http://7dney.by), «Поговори со мною, мама», «Мозаика души», «История одной фотографии художника Руслана Вашкевича» («СБ. Беларусь сегодня», https://www.sb.by), «”Лёгкага паркету”, Маша!», «”Студэнтам года” стаў чалавек-аркестр» («Звязда», http://zviazda.by), «Ёсць такая прафесія – жыць дзецьмі», «Да справы – з душой» («Новае жыццё», http://novgazeta.by), «Как будто создана для этой работы», «Большой багаж педмастерства», «Блеснул индивидуальным мастерством», «С солдатских лет», «В новом

рентген-кабинете новый хозяин», «Живой портрет на деревенском пейзаже» («Маяк» http://maiak.by), «Полвека в любви и согласии», «Когда счастье – в семье», «Жить с открытой душой», «Рука об руку на жизненном и творческом пути», «Под родовым кровом Высоцких», «Ёсць моладзь – ёсць надзея», «Есть такая династия» («Шахцёр», http://shahter.by), «Равнение на лучших: Андрей Целуйко» («Зара над Нёманам», http://www.mosty-zara.by), «Быць сапраўднай гаспадыняй» («Пухавіцкія навіны», http://www.gorka.by), «Часлаў Астрэйка – кіраўнік сваёй эпохі» («Маладзечанская газета», www.mgazeta.by), «Первым делом самолеты…», «Жыццёвыя перапетыі Марыі Якавенка» («Веснік Чэрыкаўшчыны», http://www.cherikovnews.by), «Служба ў органах – сапраўднае прызванне» («Хойніцкія навіны», http://www.hoiniki.by), «У таленавітага настаўніка – таленавітыя дзеці» («Кліч Радзімы», http://www.klich.by), «Не стоит деревня без праведника» («Полесская правда», http://www.pinsknews.by) і іншыя.

Працуючы ў фармаце партрэтнай замалёўкі, журналіст, нічога не дадумваючы ад сябе, пры апісанні жыцця свайго героя (або герояў) можа падпарадкаваць факты ўласнаму асэнсаванню, падзяліцца асабістымі ўражаннямі, выказаць сваё эмацыянальнае стаўленне да персанажаў, спрагназаваць на аснове сабраных звестак развіццё сітуацыі. Прапускаючы ўсе факты скрозь аўтарскае бачанне, ён ажыццяўляе іх мастацкую трансфармацыю. Малюючы партрэт чалавека, журналіст фіксуе самыя істотныя характарыстыкі асобы (прафесійныя, сацыяльныя, сямейныя), накіроўваючы аб’ектыў думкі так, каб стварыць для чытачоў поўную, выразную выяву героя. Гэта можа праяўляцца ў падрабязным апісанні знешнасці героя, яго ўнутранага свету, звароту па каментарыі-характарыстыкі іншых людзей (блізкіх, сяброў, знаёмых, калег). Якраз такія меркаванні, а не толькі ацэнка журналіста, робяць партрэт аб’ектыўным, цікавым і шматгранным. Аднак часам у партрэтных замалёўках журналіст спасылаецца толькі на словы адной крыніцы, якой часта бывае сам герой публікацыі. Трапляючы ў палон таго, што герой сам думае аб сабе, журналіст імкнецца прадставіць яго ў лепшым святле, пакідаючы па-за ўвагай прынцып непрадузятасці. Вядома, партрэт можна напісаць і засноўваючыся на інфармацыі, атрыманай толькі ад героя. Аднак такія матэрыялы, як паказвае практыка, выглядаюць аднабокімі і «плоскімі». Калі журналіст вырашыў стварыць паўнавартасны партрэт чалавека, лепш за ўсё назапасіць інфармацыю аб ім з некалькіх крыніц, што ўзбагаціць матэрыял і надасць яму «рэльефнасць».

Структурна-кампазіцыйная пабудова кожнай замалёўкі ўяўляе сабой дакладна арганізаваную сістэму, якая ўключае пэўныя элементы. Так, у дачыненні да замалёўкі (прынамсі, партрэтнай) гэта могуць быць: загаловачны радок, лід, асноўны корпус тэксту (вобразная характарыстыка і апісанне прадмета адлюстравання, асобныя «штрыхі» з гісторыі жыцця чалавека, уласныя ўражанні аўтара, маналог героя, каментарыі і ацэнкі іншых рэспандэнтаў), візуальнае суправаджэнне (часцей за ўсё фотаілюстрацыі).

Здараецца так, што журналіст празмерна захапляецца асацыятыўным мысленнем, у выніку чаго замалёвачнасць адыходзіць на другі план, саступаючы месца эсэістычнай манеры аповеду, як у публікацыі «За расставаньем будет встреча. Музыкант Леонид Гурвич вернулся из Германии в Беларусь талантливым композитором» («СБ. Беларусь сегодня», https://www.sb.by).

Асобную ўвагу звернем на загаловак – адзін з неад'емных ідэйна-кампазіцыйных складнікаў любога журналісцкага тэксту. Загаловак (загаловачны комплекс) павінен адаптавацца да законаў напісання вэб-тэкстаў. Як адзначае А.А. Градзюшка, у вэб-журналістыцы загаловак павінен быць максімальна інфарматыўным, каб даць чытачу ўяўленне аб змесце тэксту. Вобразныя газетныя загалоўкі для інтэрнэту зусім не падыходзяць [2].

Аднак на практыцы ўсё выглядае з дакладнасцю наадварот – большасць загалоўкаў газетных інтэрнэт-версій не адпавядае такім патрабаванням з прычыны сваёй абстрактнасці, вобразнасці, інфармацыйнай «расплывістасці». Радзей сустракаюцца заглоўкі, набліжаныя да новых рэалій успрымання: «Костюковчанин Никита Котелев увлекается пен таппингом, но мечтает быть поваром» («Голас Касцюкоўшчыны», http://www.golk.by), «Сяргей Сцяпанавіч ЗЯНЬКО – загадчык фермы «Нарэйшы» ААТ "Агра-Дубінское"» (http://psl.by), «Дмитрий Белоусов: «Сузор'е» – моя вторая семья» (http://shahter.by).

Да таго ж трэба ведаць асноўныя прынцыпы размяшчэння тэксту ў інтэрнэце, у прыватнасці, абавязковае выдзяленне ў ім сэнсавых частак (як правіла, адна ідэя – адзін абзац) для больш аптымальнага і зручнага чытання з экрана. На многіх сайтах змястоўныя, вартыя чытацкай увагі матэрыялы змешчаны суцэльным тэкстам, нават без мінімальнага члянення на абзацы, што, безумоўна, усцяжарвае, а часам робіць немагчымым працэс іх прачытання. Увогуле для інтэрнэту характэрна беглае, хуткаснае чытанне (кросчытанне), калі чалавек

выбірае інфармацыю, за якую чапляецца вока. Калі «зачэпіцца», то і верагоднасць прачытаць такі тэкст ад пачатку і да канца ўзрастае.

Да *натурных* замалёвак журналісты звяртаюцца не так часта, як да партрэтных. Асноўныя мэты такіх публікацый – праінфармаваць грамадства аб наяўных праблемах навакольнага асяроддзя («Не пазнаць былую Уздзянку», «Таполі») («Чырвоная зорка», http://www.uzdanews.by) або праз прыродныя мініяцюры садзейнічаць рэкрэацыі і забаўленню чытачоў («Нечаканая сустрэча», «Таямніцы гарадскога парку» («Чырвоная зорка», http://www.uzdanews.by), «Восеньскія імпрэсіі Браслаўшчыны» («Звязда», http://zviazda.by) і іншыя. У фармаце інтэрнэт-парталаў натурная замалёўка можа трансфармавацца ў фотазамалёўку, пакідаючы за вербальнай часткай толькі загаловак і лід: «Теплые краски холодной осени: прогулка по вечернему Минску»(tut.by): *Ковер из желтых листьев, которые еще не успели убрать; ветер, который треплет волосы; мокрый асфальт, в котором отражается город… и запахи осеннего города. Осень в городе бывает разная. Даже в ненастную погоду и поздно вечером в ней можно найти свое очарование и красоту. Главное – одеться потеплее. Фотокорреспондент TUT.BY Дмитрий Брушко прогулялся по вечерним улицам Минска, чтобы убедиться, что у природы нет плохой погоды.* Эфект вобразнасці і “замалёвачнасці” дасягаецца тут за кошт першага сказа, створанага як нанізванне на агульны асацыятыўны стрыжань аднатыповых па будове канструкцый з розным сэнсавым акцэнтам-вобразам – *дыван, вецер, асфальт*.

У некаторых выданнях замалёўцы прысвечаны асобныя рубрыкі, як на сайце газеты «Працоўная слава» (http://psl.by) «Нататкі з вясковай хаткі», якую складаюць не толькі *партрэтныя* («Заатэхнік з душой марака», «Жывуць у гармоніі з прыродай», «Жыццё і праца зліліся ў адно», «Ён, Яна і бэзавы куст», «Першы пасляваенны трактарыст», «Любую справу здолее, асіліць», «Жыццё, і песня, і любоў», «Зямля – яго лёс», «Вясёлка вясковага падворка», «Адценні іх шчасця», «Прылёты бусла», «Сакрэт яе шчаслівай старасці»), але і *натурныя* («Трывалыя карані…», «Лімонны дух»), *падзейныя* замалёўкі («Падарунак», «Звярынец за шафай», «У складанай жыццёвай сітуацыі», «Калодзежы памяці не перасыхаюць... », «Святочны сняданак»).

Звяртаюцца да жанравых разнавіднасцей замалёўкі і журналісты беларускіх інтэрнэт-выданняў: «Ноябрь», «Дорога домой: осенний этюд», «Студентка, журналистка и просто красавица!» (http://www.websmi.by), «Тур 14. Зарисовка. Сморгонский антураж» (www.pressball.

by) і іншыя. Нягледзячы на тое, што ствараюцца такія матэрыялы для анлайнавых выданняў, выразных адрозненняў ад электронных версій газет мы не знайшлі (тыя ж недахопы ў фармулёўцы загалоўкаў, структураванні тэксту), за выключэннем аднаго – больш увагі надаецца візуалізацыі вербальнай часткі і пошуку новых творчых рашэнняў, як у матэрыяле «500 километров парень буквально на руках добирался до Балтийского моря – исполнил свою мечту» (http://citydog.by). Аповед аб лёсе чалавека, які трапіў у складаную жыццёвую сітуацыю і не зламаўся, пачынаецца з партрэтнай замалёўкі, што арганічна пераходзіць у рэпартаж аб самім падарожжы (жанравы сімбіёз).

Адной з асаблівасцей функцыянавання замалёўкі ў такіх сеткавых выданнях, як інтэрнэт-парталы, з’яўляецца тое, што яна рэдка выкарыстоўваецца ў чыстым выглядзе, а выступае элементам больш складанага, буйнога жанру, напрыклад, рэпартажу ці інтэрв’ю: «Восемь месяцев одиночества. Как друг детства из интерната продал Сашу в рабство дагестанцам», «Без рук и ног плывет к мечте. Алексей Талай, который подорвался на мине, готовится к Паралимпиаде», «С небес под землю. Ради детей решилась на работу в шахте», «Городские энтузиасты в белорусской глубинке: “Это невероятное вдохновение!”» (tut.by); «“Я чувствую себя счастливой и хочу приносить людям радость!”. Как живет девушка со страшным диагнозом после судов с медицинским центром», «“Ворота” в другую жизнь. Белорус окончил БГУ и улетел в Альпы» (onliner.by). Апошняя гісторыі з’яўляецца фрагментам серыі матэрыялаў аб лёсах беларусаў, якія па розных прычынах апынуліся за мяжой.

Такім матэрыялам уласцівыя ўсе прыкметы мультымедыйнасці журналісцкага тэксту ў інтэрнэт-СМІ: візуалізацыя інфармацыі праз фатаграфічны рад (ад 5 да 10 фатаграфій), відэа- ці аўдыёўстаўкі (або адсыл да іх), гіпертэкставая структурызацыя (унутраныя ці знешнія спасылкі, бэкграўнды). Імкліва развіваюцца ў такіх фарматах і розныя прыёмы наратыўнасці (апавядальнасці) – узмацняецца дынаміка сюжэту, чаргуецца тэмп, гісторыя набывае яскравы сюжэт, канфлікт, сістэму персанажаў. Характар выкладу інфармацыі ў наратыўнай форме становіцца важным фактарам паспяховага ўзаемадзеяння з масавай інтэрнэт-аўдыторыяй. Да таго ж тэхнічныя магчымасці сеткавых СМІ дазваляюць сумесна з аўдыторыяй прааналізаваць уражанні ад публікацыі праз інтэрактыўныя сэрвісы – каментарыі, абмеркаванне на форумах і сацсетках. У выніку медыяпрастора ўспрымаецца як гіпергісторыя, сатканая з мноства аповедаў, што прэзентуюцца як паслядоўна, так і адначасова.

У межах інфармацыйных парталаў могуць назірацца інавацыйныя «пераўвасабленні», трансфармацыі жанравай палітры замалёўкі, звязаныя найперш з працэсамі інтэрнэтызацыі і канвергенцыі. Так, на партале tut.by мы знайшлі цікавы матэрыял, які можна кваліфікаваць як партрэтную замалёўку-анонс «“Петрович был тренером уровня Лиги чемпионов”. «Беларусь-5» покажет фильм к 80-летию Мешкова». Анансаванне фільма, прысвечанага жыццю знакамітага трэнера Беларусі, з’яўляецца спробай праз кросмедыйныя механізмы (калі адна гісторыя распавядаецца некалькімі каналамі) ахапіць як мага большае кола зацікаўленай аўдыторыі. З пункту гледжання структурна-кампазіцыйнай арганізацыі гэты матэрыял утрымлівае ўсе кампаненты, характэрныя і для традыцыйнай замалёўкі, з той толькі розніцай, што яны адаптуюцца пад мультымедыйны фармат кантэнту (вербалізацыя + візуалізацыя). **Лід-цытата** з фільма вядомага беларускага журналіста Сяргея Новікава выступае натуральным фонам для развіцця фабулы і настройвае на лірычны лад: *Анатолий Мешков обладал уникальным даром находить золотые крупицы талантов среди песка повседневности. Увлеченный трудом, он предопределил большое будущее брестского гандбола, он первым в него поверил. Команды, которые готовил Анатолий Петрович, регулярно выигрывали различные соревнования в республике, юношеские сборные, к подготовке которых он был причастен, брали призовые места на первенствах Советского Союза.*

**Першы эпізод** замалёўкі інфармуе аб значнасці асобы Анатоля Мяшкова як заснавальніка гандболу на Брэстчыне і выхаваценя цэлага пакалення выдатных беларускіх спартсменаў. Журналіст з першых радкоў акцэнтуе ўвагу на прафесійную (сацыяльна скіраваную) дзейнасць героя. **Другі эпізод** – станаўленне асобы ў непарыўнай сувязі са сваёй эпохай (часы 60-х гадоў). **Трэці эпізод** – зварот да каментарыя Сяргея Канашыца з яго кнігі «Анатолий Мешков: жизнь в игре»: *Сегодня невозможно себе представить спортивный Брест без его визитной карточки – гандбольного клуба имени А.П. Мешкова. Кажется, что он был всегда. Возможно, это ощущение проистекает из самого названия, ведь имя Анатолия Петровича Мешкова несет в себе печать рождения гандбола в городе, а значит, дышит историей.* Гэта своеасаблівая падрыхтоўка для **чацвёртага эпізода –** пераходу ад асабаснага партрэта да калектыўнага, каманднага, які наўрад ці змог атрымацца такім каларытным і выразным, калі б не праца трэнера. **Пяты эпізод** (як і другі) канстатуе асобныя звесткі з біяграфіі героя. **Шосты эпізод**

звязвае мінулае з сучасным і распавядае аб тым, хто сёння працягвае справу славутага трэнера: *….А в 2005 открылись двери крупнейшей гандбольной арены страны — дворца спорта «Виктория им. А.П. Мешкова», на стенах которого размещен девиз тренера: «Победа команды начинается с тебя»*. **Сёмы эпізод** узмацняе папярднюю думку рэплікай Сяргея Навіцкага: *Когда имя человека увековечено на фронтоне такого сооружения, кажется, что не нужны уже другие слова. Но мы все-таки их скажем. Память о человеке может сохраняться по-разному. Она может быть увековечена в камне, она может застыть в металле, а о герое нашего повествования ежедневно напоминают звонкие детские голоса.* **Восьмы эпізод** зноў вяртае да сучаснасці і апісвае спартыўныя дасягненні моладзі палаца спорту «Вікторыя». **Дзявяты эпізод** закальцоўвае кампазіцыю замалёўкі словамі вядомага трэнера Леаніда Вашкевіча, з якіх і пачынаецца загаловак: *Петрович – это тренер уровня Лиги чемпионов. И если бы он сегодня был жив, именно он вел бы БГК к победам в этом турнире.* Да асноўнага кампазіцыйнага ядра прымыкае інфармацыя аб анонсе фільма і фрагмент відэароліка з канала YouTube. На наш погляд, добра структураванаму вербальнаму матэрыялу не хапіла ілюстрацыйнага суправаджэння. Змешчаныя ў тэксце два чорна-белыя фотаздымкі не змаглі ў поўнай меры перадаць інфарматыўнасць і выразнасць прадмета апісання.

У заключэнне адзначым, што выбар жанравых разнавіднасцей замалёўкі залежыць ад тэмы і задач, што стаяць перад журналістам, але ў кожным асобным выпадку замалёўка звычайна ўтрымлівае вялікую публіцыстычную, эмацыянальную, сэнсавую нагрузку, аўтарскае меркаванне. Гэты жанр даволі дэмакратычны і гнуткі да інавацый, хаця і неаднолькава папулярны і запатрабаваны ў розных тыпах беларускіх інтэрнэт-СМІ.

***Літаратура***


1. Бобков, А.К. Газетные жанры: учеб. пособие. − Иркутск: Ирк. унив., 2005. – 64 с.
2. Градюшко, А.А. Жанрово-стилистические особенности новостной веб-журналистики // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна. – 2014. – № 3 (44). – С. 114–118.
3. Ким, М.Н. Основы творческой деятельности журналиста: учебник / М.Н. Ким. – Санкт-Петербург: Питер, 2011. – 393 с.
4. Лазутина, Г.В. Жанры журналистского творчества: учеб. пособие / Г.В. Лазутина, С.С. Распопова. – Москва: Аспект Пресс, 2012. – 319 с.

5. Орлова, Т.Д. Жанровая дифференциация в журналистике // Рэгіянальныя СМІ ў сучаснай інфармацыйнай прасторы: матэрыялы рэсп. навук.-практ. семінара, 2–3 чэрвеня 2011 г. – Минск, 2011. – С. 175–181.
6. Стральцоў, Б.В. Метад і жанр. Асновы творчага майстэрства журналіста / Б.В. Стральцоў. – Минск: БДУ, 2002. – 118 с.

**Наталля Зубчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ГІСТОРЫЯ «ЗВЯЗДЫ» Ў НАВУКОВЫМ АСЭНСАВАННІ

У сістэме сучаснай грамадска-палітычнай прэсы газеце “Звязда” належыць выключная роля. Менавіта гэта выданне вызначыла напрамак развіцця беларускага нацыянальнага друку. Выдаўцамі “Звязды” была распрацавана тэорыя нацыянальнай публіцыстыкі, на яе старонках сфарміравалася прафесійная журналісцкая школа.

Вывучэнне гісторыі станаўлення і развіцця дадзенага выдання запатрабавана сучасным працэсам пераасэнсавання каштоўнасных арыентыраў, вопыту практычнай дзейнасці. У працэсе даследавання асобных аспектаў развіцця газеты ў розныя гістарычныя перыяды акцэнты рабіліся на адпаведнасці яе працы тым грамадска-палітычным працэсам, у кантэксце якіх існавала выданне. Тым не менш, менавіта “Звязда” належыць да тых газет, дзейнасць якой у розныя часы прыцягвала ўвагу гісторыкаў друку.

Практычна першай спробай навуковага асэнсавання працэсу развіцця газеты стала выдадзеная ў 1957 г. манаграфія М.С. Зярніцкага «Газета “Звезда» ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі” (Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957). Дзейнасць рэдакцыі “Звязды” разглядаецца аўтарам ў кантэксце развіцця агульнабальшавіцкага руху на тэрыторі Беларусі. Па сутнасці, у выданні былі адлюстраваны важнейшыя грамадска-палітычныя працэсы, апублікаваны галоўныя праграмныя дакументы савецкай улады. Акрамя таго, масавая бальшавіцкая газета выконвала вялікую працу па арганізацыі эфектыўнай дзейнасці рэдакцыі, якасці газетных матэрыялаў, выкарыстоўваючы разнастайныя формы і метады масавай работы, практычны вопыт іншых бальшавіцкіх газет.

Значнасць наступнага даследавання М.С. Зярніцкага “Белорусская советская печать в годы иностранной интервенции и гражданской войны” (Минск, Высшая школа, 1963) заключаецца якраз у тым, што аўтар разглядае дзейнасць газеты ў кантэксце фарміравання беларускай